У адпаведнасці з планам ідэалагічнай, сацыяльнай і выхаваўчай працы ў мінулую пятніцу, 21 сакавіка 2014 года, у межах конкурса прафесійнага майстэрства куратараў навучальных груп БДПУ ў інтэрнаце №8 адбылася адкрытая куратарская гадзіна, якую праводзіла дацэнт кафедры матэматычнага аналіза Хурсевіч Галіна Яўгенаўна – прадстаўнік матэматычнага факультэта ў конкурсе.

Незвычайны фармат куратарскай гадзіны быў абраны з нагоды студэнтаў, у тым ліку замежных. Адметнасцю задумкі было тое, што планавалася пабудаваць праграму на сяброўстве дзвюх краін – Туркменістана і Беларусі, прадстаўнікі якіх з'яўляюцца студэнтамі матэматычнага факультэта.

Праграма мерапрыемства складалася з некалькіх аб'ёмных частак, таму падрыхтоўка пачалася за некалькі тыдняў, а ўдзел у ёй прымала вялікая колькасць студэнтаў.

Пачалося ўсё са сустрэчы гасцей. Далей студэнты ў суправаджэнні тэматычных прэзентацый расказалі пра родныя мясціны і традыцыі, у падтрымку слаўлення якіх гасцям былі прапанаваны нацыянальныя стравы: туркменскія манты і плоў, беларускія дзіруны. Адначасова з гэтым былі прадэманстраваны фотаздымкі, якія адлюстроўвалі працэс прыгатавання ежы.

У кожнага народа ёсць не толькі традыцыі, але і абаронцы, якія ахоўваюць іх. Пра традыцыі рыцарства і паведаміў адзін са студэнтаў 201 групы – Аліпаў Андрэй.

Ні адзін народ не існуе асобна ад іншых – толькі ва ўзаемаадносінах і сяброўстве. Тут гасцей чакаў прыемны падарунак – беларуская полька, падрыхтаваная туркменскімі хлопцамі і беларускімі дзяўчатамі. Сумесны танец іншы раз нагадаў, што мы жывем у адзінстве культур, традыцый і часу.

Існуе думка, што ў кожнага народа сваё адметнае пачуцце гумару, у якім раскрываюцца адметныя асаблівасці людзей і характараў. Пагэтаму мерапрыемства не абыйшлося без КВЗ, і камандай матэматычнага факультэта «FM» былі паказаны некалькі нумароў канцэртнай праграмы, чым і скончылася куратарская гадзіна.

*Сардэчная Любоў, матэматычны факультэт, 202 група*